Салаўёў М.

# РАСКАЗЫ ЛЁТЧЫКА-ГЕРОЯ

4 ЛІПЕНЯ гэтага года родныя і блізкія, аднапалчане і таварышы па рабоце павіншавалі Ціхана Свірыдавіча Жучкова, ураджэнца вёскі Бахацец Чавускага раёна, са знамянальнай датай – 60-годдзем з дня нараджэння. Герой Савецкага Саюза, падпалкоўнік запаса Жучкоў атрымаў у гэтыя дні шмат цёплых тэлеграм, віншаванняў з самымі добрымі і шчырымі пажаданнямі. Прыемна, калі пра твой дзень нараджэння памятаюць сябры і таварышы. А ў Ціхана Свірыдавіча сяброў і таварышаў нямала. Гэта – аднапалчане, з якімі ішоў па франтавых дарогах, абараняючы ленінградскае неба, гэта – таварышы па выпрабаваўчай рабоце, гэта – таварышы па сённяшняй рабоце ў Міністэрстве грамадзянскай авіяцыі. Захочаш сабрадь .усіх разам – не збярэш, не здолееш за адным сталом размясціць. Ды і сабраць усіх разам не магчыма. Прайшлі гады, цяжка стала баявым таварышам наведваць адзін аднаго. Але ніхто з іх не забыўся пра юбілей таварыша, павіншавалі ўсе, пажадалі доўгіх год жыцця, вялікага шчасця і радасці ў жыцці.

Не забылі пра юбілей Ціхана Свірыдавіча і яго юныя сябры – школьнікі. Шмат у яго з імі было сустрэч, шмат разоў давялося Жучкову расказваць аб ваенных гадах, аб баявых палётах, аб сутычках з гітлераўскімі лётчыкамі.

Затаіўшы дыханне, слухаюдь успаміны ветэранаў вайны школьнікі. Калі перад імі выступае баявы лётчык, Герой Савецкага Саюза, які ў мірныя дні шмат працаваў лётчыкам-выпрабавальнікам, у зале стаіць незвычайная цішыня. Аднойчы Ціхан Свірыдавічі пачаў свае ўспаміны з таго вераснёўскага дня 1942 года, калі ўпершыню прыбыў на палявы аэрадром.

Стаў расказваць, і яму здалося, што рабятам гэта нецікава. Але варта было Жучкову ўспомніць, як яму дапамагаў старшы лейтэнант Татаранка, як зразумеў, што дзеці захоплены, і ўспаміны пайшлі свабодна і лёгка.

– Памятаю, як цяпер, расказ Татаранкі пра камандзіра палка палкоўніка Кандрацьева. Памятаю, тады мой вядучы гаварыў: наш камандзіір – твой зямляк. З Віцебска родам. Уся баявая дзейнасць палкоўніка Кандрацьева звязана з нашым палком. Памочнікам камандзіра палка сустрэў вайну з белафінамі. За праяўленую ў баях мужнасць быў удастоены яшчэ ў 1940 годзе высокага звання Героя Савецкага Саюза. А Вялікую Айчынную вайну Пётр Васільевіч сустрэў ужо камандзірам палка, які 18 студзеня 1942 года быў пераўтваран у гвардзейскі. Назаўсёды запомніў я свайго камандзіра. Як мы гаравалі,

калі 3 чэрвеня 1943 года ён не вярнуўся з баявога задання, загінуў у сутычцы з варожымі летчыкамі.

У ТОЙ ВЕЧАР доўга працягвалася гутарка Ціхана Свірыдавіча з піянерамі. Яны слухалі яго ўважліва, задавалі шмат пытанняў, імкнуліся аб усім распытаць, хацелі больш даведадца. Аднак ці можна за адну сустрэчу, няхай і самую доўгую, расказаць пра ўсё франтавое жыццё, пра ўсе паветраныя баі, пра збітыя асабіста і ў групавых баях варожыя самалёты?

Тады і ўспомніўся Ціхану Свірыдавічу бой, калі шэсць знішчальнікаў палка ўступілі ў няроўную сутычку з дваццаццю варожымі самалётамі. Нашы знішчальнікі нанеслі раптоўны удар па гітлераўцах, і чатыры варожыя самалёты тут жа паляцелі да зямлі, збітыя трапным агнём. Тады, у азарце бою, не ўсё ўбачыў Жучкоў, не ўсё зразумеў. Толькі адно заўважыў добра: шаснаццаць фашысдкіх лётчыкаў, не прымаюць бою, развярнулі самалёты і кінуліся адступаць. Гэта было дзіўна, але стала зразумелым на зямлі, калі вядучы групы далажыў камандзіру, што з першай жа атакі было збіта чатыры фашысцкія самалёты.

...Жучкоў спыніўся, каб перадыхнуць, і гэта адразу ж выкарысталі школьнікі. Пасыпаліся з усіх бакоў пытанні. Так працягвалася да той самай мінуты, пакуль Жучкоў не прыпомніў красавіцкі дзень сорак чацвёртага, калі яму разам з вядучым Цапавым давялося ўступіць у сутычку з гітлераўскімі лётчыкамі. Тады варожыя самалёты нечакана вынырнулі з-за воблакаў, атакавалі самалёт вядучага. Яму пагражала гібель. І тут прыйшоў на дапамогу Жучкоў. Ён кінуў свой знішчальнік насустрач фашысту. Чарга прагучэла на імгненне раней, чым паспеў гэта зрабіць вораг. Прашыты кулямётным агнём нямецкі знішчальнік па інерцыі пранёсся міма самалёта Жучкова і ўспыхнуў, быццам факел.

На нейкі момант разгубіўся лётчык, другога "месершміта". Але гэтага імгнення хапіла Жучкову, каб перанесці агонь на яго самалёт. Чарга прайшла міма кабіны варожага пілота, але сваё зрабіла: фашыст кінуў самалёт у бок, рвануў яго ўверх і схаваўся ў воблаках.

У БАЯВЫМ жыцці Ціхана Жучкова былі розныя эпізоды, розныя паветраныя баі. У той вечар не мог усё расказаць школьнікам. Але яны шмат разоў запрашалі ветэрана да сябе на сустрэчы. І даведаліся, што калі наступіла вясна сорак пятага, лётчык Жучкоў меў ужо на сваім рахунку 250 баявых вылетаў, 37 паветраных баёў, адзінаццаць збітых асабіста варожых самалётаў, семдзесят вылетаў на разведку і аэрафотаздымкі аэрадромаў праціўніка, месц базіравання яго баявых караблёў, ваенна-марскіх баз.

Лётчыку , заўсёды цікава гутарыць са школьнікамі. Яго пакарае іх шчырасць, жаданне ўсё ведаць. Ён бачыдь у піянерах тых, хто праз нейкі час будзе ахоўваць нашу Айчыну, магчыма, і паветраныя яе рубяжы, будзе стаяць на варце міру, каб ніколі больш над нашай краінай не палыхаў агонь вайны.

Салаўёў, М. Раcказы лётчыка-Героя / М. Салаўёў // Іскра (Чавусы). — 1982. — 8 ліпеня. — С. 2.